БЕЛАРУСЬ НЕ СУПРАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВЫ САБРАЦЬ ДЫПЛАМАТАЎ СНД У КІЕВЕ

Выканаўчы сакратар Садружнасці Незалежных Дзяржаў быў праінфармаваны па дыпламатычных каналах, што Беларусь не супраць пазачарговага пасяджэння Савета міністраў замежных спраў СНД у Кіеве. Пра гэта ўчора на брыфінгу паведаміў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК.

Пры гэтым ён нагадаў, што, як вядома, рашэнні наконт правядзення такога пасяджэння прымаюцца кансэнсусам.

«Мы выказаліся за правядзенне перад гэтым мерапрыемствам кансультацый на ўзроўні пастаянных прадстаўнікоў краін — удзельніц СНД для ўзгаднення неабходных дакументаў, якія плануецца разгледзець на пасяджэнні Савета МЗС СНД», — дадаў прэс-сакратар дыпламатычнага ведамства Беларусі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

УМОВЫ ДЛЯ ЖАНОЧАГА БІЗНЕСУ

…створаць на Магілёўшчыне. Аб гэтым паведамлялася падчас пасяджэння абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва.

У вобласці расце колькасць жанчын, якія займаюцца ўласнай справай, але пакуль у іх няма спецыяльных умоў па адкрыцці і вядзенні бізнесу. Цяпер гэтае пытанне вырашаецца. «Ужо створана ініцыятыўная група і вядзецца падбор пляцоўкі для адкрыцця жаночага бізнес-інкубатара, — адзначыў намеснік старшыні камітэта эканомікі аблвыканкама Віктар Красоўскі. — Гэтая арганізацыя будзе займацца падтрымкай бізнес-вумэн на ўсіх этапах іх работы: аказваць кансультацыйныя і інфармацыйныя паслугі па арганізацыі і вядзенні прадпрымальніцкай дзейнасці, садзейнічаць у пошуку партнёраў і фінансавых рэсурсаў, перадаваць у арэнду спецыяльна абсталяваныя офісныя і вытворчыя памяшканні.

Дарэчы, летась у Магілёўскай вобласці створаны 1622 камерцыйныя арганізацыі, з якіх 839 — у сельскай мясцовасці. Для параўнання, на пачатак мінулага года іх было 9206. Сёння каля трэці абласнога бюджэту сфарміравана за кошт прадпрымальніцкага сектара.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

САДОК ЗАМЕСТ ПРАФІЛАКТОРЫЯ

Сапраўдным падарункам для маладых маці да свята 8 Сакавіка стане новы дзіцячы садок № 19, які адкрыецца на базе былога дзіцячага прафілакторыя прадпрыемства «Крышталь».

Як расказалі ў аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Навабеліцкага раёна Гомеля, пасля рэканструкцыі будынак адпавядае ўсім нормам і патрабаванням дашкольнай установы. Тут створаны аптымальныя ўмовы для дзяцей і педагогаў. У групах прадумана размяшчэнне дзіцячай мэблі, створаны цэнтр дзіцячай творчасці, набыты шырокі асартымент абсталявання для арганізацыі сумеснай і самастойнай дзейнасці: дыдактычныя, развіваючыя гульні, наборы будаўнічага матэрыялу, дзіцячага посуду, мяккія модулі… Ёсць фізкультурная і музычная залы. Дзіцячы садок здольны прыняць каля 300 дзяцей. Такім чынам, новая дашкольная ўстанова павінна паменшыць дэфіцыт месцаў для дашкольнікаў, характэрны для новабудоўлі — 104-га мікрараёна Гомеля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КАЛІ ПРЫЕДЗЕ АЎТОБУС, ПАДКАЖА… МАБІЛЬНІК

Мабільны аператар МТС пачаў укараняць унікальную для Беларусі паслугу — інфармаванне пра фактычны час прыбыцця грамадскага транспарту. Пакуль паслуга даступная толькі жыхарам Віцебска.

Скарыстацца ёй змогуць як уладальнікі сучасных смартфонаў, так і карыстальнікі простых мадэляў тэлефонаў. Час прыбыцця транспарту разлічваецца на падставе рэальнага руху аўтобусаў з улікам затораў на дарогах, аварый, спазненняў у час пік і г. д., а не статычнага раскладу, указанага на прыпынках ці інтэрнэт-сайтах. Віцебскія аўтобусы аснашчаны сістэмай GPS — прыёмнікамі спадарожнікавай навігацыі, а таксама SIM-картамі МТС. Сістэма вызначае месцазнаходжанне машын, а атрыманыя даныя адпраўляе па мабільным інтэрнэце ў дыспетчарскія пункты. На падставе гэтай інфармацыі і фактычнай адлегласці да прыпынку сэрвіс разлічвае рэальны час.

Кошт аднаго SMS-запыту складае 180 рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Институт бизнеса и менеджмента технологий БГУ
ПРИГЛАШАЕТ НА ПЕРЕПОДГОТОВКУ
«Европейский менеджер»

Системная практикоориентированная подготовка менеджеров:
- продолжительность обучения – 18 месяцев;
- вечерняя форма обучения;
- квалификация «менеджер-экономист»;
- диплом государственного образца;
- прием документов по 12 марта 2014 г.

Тел.: (029) 111 30 49; (017) 259 70 78. www.sbmt.by

Лицензия № 02100/0558565 выдана Министерством образования РБ 09.02.2010 г. Действительна до 30.04.2014 г. УНП 101117830.

Водар жыцця з Аленай Шамаль

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У 1995 годзе ў беларускім парламенце было толькі 9 жанчын. Апошнім часам жанчыны складаюць стабільныя 30% дэпутацкага корпуса. Аднак сярод беларускіх міністраў — толькі адна дама. Чаму так не проста нам дасягнуць гендарнай роўнасці ў справе кіравання дзяржавай?

— Думаю, не варта імкнуцца да гендарнай роўнасці ва ўсіх аспектах. З-за біялагічных асаблівасцяў жанчына не можа выконваць, скажам, такую ж фізічна цяжкую працу, якая пад сілу толькі мужчынам. Але ў яе павінны быць аднолькавыя правы і магчымасці ў сацыяльным плане. Ёй неабходна мець аднолькавыя з мужчынам магчымасці працаўладкавання, адукацыі, удзелу ў сямейна-бытавой сферы. Канешне, жанчыны павінны прымаць актыўны ўдзел у розных сферах дзейнасці дзяржавы і грамадства. Дарэчы, у мясцовых Саветах дэпутатаў жанчын значна больш, чым у парламенце — да 45%.

Але, на жаль, у нас па-ранейшаму існуюць стэрэатыпы пра тое, што мужчыны — больш рацыянальныя і прагматычныя, а жанчыны — больш эмацыянальныя і халерычныя. Сферай дзейнасці жанчын у нас застаюцца пераважна адукацыя, ахова здароўя, сфера паслуг. А мужчыны часцей становяцца кіраўнікамі. Гэта тычыцца і сям'і. Дадому жанчына павінна вярнуцца з працы прыгожай, у добрым настроі, прыгатаваць вячэру, паклапаціцца пра дзяцей, а мужчына — прыйшоў і адпачывае. Ён — гаспадар.

І ўсё ж у Беларусі ўдалося многага дабіцца ў справе гендарнай роўнасці. Пры Савеце Міністраў працуе Нацыянальны савет па гендарнай палітыцы. Урад склаў таксама Нацыянальны план дзеянняў па забеспячэнні гендарнай роўнасці ў нашай краіне. Але наблізіцца да ідэалу мы зможам толькі тады, калі і мужчыны да жанчыны, і жанчыны да мужчын будуць ставіцца з аднолькавай павагай.

І яшчэ адзін важны момант. Жанчына можа перавярнуць горы, зрабіць немагчымае, калі адчувае сябе каханай. Для нас вельмі важная ўвага дарагіх нам, блізкіх мужчын. На якой бы мы ні былі пасадзе, і які б статус ні мелі.

— Ці патрэбны ў палітыцы жаночы погляд?

— Безумоўна. Жанчына заўсёды імкнецца дапамагчы больш слабаму. Яна лепш разбіраецца ў некаторых сацыяльных пытаннях. Напрыклад, у нас 160 тысяч жанчын самастойна выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. І толькі каля 10 тысяч такіх мужчын. Без жаночага погляду на гэтую праблему цяжка было б знайсці аптымальныя падыходы на заканадаўчым узроўні. Мужчыны ў прыняцці рашэнняў больш катэгарычныя, жанчыны заўсёды імкнуцца згладзіць вострыя вуглы, знайсці больш прымальны варыянт для розных бакоў.

— Напярэдадні свята журналісты «Звязды» апытвалі розных людзей пра галоўных жанчын у іх жыцці. І мне хочацца спытаць вас: а ў вашым жыцці хто самыя галоўныя жанчыны?

— Мне складана адказаць. Як дачцэ, вядома ж, мне бясконца дарагая мая маці — жанчына, якая паўплывала на мой жаночы пачатак. Разам з тым, я сама — маці дачкі. Гэта — два вельмі розныя моманты, але падзяліць іх немагчыма. Маці ты ўдзячны. А для дзіцяці робіш усё, каб яе жыццё было лягчэй, каб даць ёй як мага больш шанцаў.

Шчасце — гэта не аморфная субстанцыя. Не павеў ветрыку. Складнікі шчасця — вынік вялікай працы.

У палітыцы неабходны жаночы погляд.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі я была маленькая, мне здавалася, што наша мама вельмі строгая. Яна выхоўвала нас у традыцыях, прытрымлівалася правілаў. Ва ўсіх у нас былі абавязкі ў сям'і. І «нельга» заўсёды азначала «нельга». У нашых бацькоў нас трое дзяцей, тры дачкі, і я — самая старэйшая. Можа, таму ад мяне і больш патрабавалі.

А калі я вырасла, калі з'явілася ўласнае дзіця, то зразумела тое пачуццё адказнасці, з якім бацькі да мяне ставіліся. Для бацькоў галоўнае, каб іх дзіця было шчаслівае. З узростам разумееш, як шмат яны далі. Дзіцячыя моманты вельмі каштоўныя. У кожнага — свая маці, але мая мама асаблівая, бо яна — мая. Яна вельмі дапамагае мне ў жыцці. Яе імя — Любоў, і яна вельмі яму адпавядае. Яна — лепшая.

— У наш час жанчыну часта вінавацяць у тым, што дзеці вырастаюць у холадзе адзіноцтва. Вечна занятай і заклапочанай маці не да іх. Можа, надышоў час перагледзець каштоўнасці цывілізацыі і вяртаць жанчын на кухню, у царкву і да дзяцей?

— Я не згодна з тым, што працуючая жанчына не здольная надаць неабходную ўвагу дзіцяці. Насамрэч, дзіцяці з пэўнага ўзросту не патрэбна, і нават супрацьпаказана, каб маці была побач з ім усе 24 гадзіны ў суткі. Але я ўпэўнена, што з дзіцем трэба размаўляць. Сама імкнуся да таго, каб дачка была мне сябрам. Каб паміж намі быў магчымы дыялог на любыя тэмы, радасныя і непрыемныя. Галоўнае, каб дзіця не адчувала сябе дрэнным. Яно павінна асэнсоўваць, што яго ўчынак, дзеянне можа быць дрэнным, але не яно само.

Праўда тое, што мы развучыліся размаўляць са сваімі дзецьмі. Тое, што мы стамляемся на працы, не апраўдвае нас. На размову з дзіцем дастаткова 15–20 хвілін раніцай і ўвечары, а ў выхадныя можна знайсці сумесны занятак, але дзіця павінна ведаць, што яно цікавае сваёй маці і можа ёй давяраць.

— Наколькі сучасны свет трансфармаваў жанчыну?

— Жанчыны сталі больш моцнымі. Такое патрабаванне часу. Такую ўстаноўку дае сабе сёння большасць жанчын. Каб канкурыраваць на рынку працы, ёй трэба быць больш адукаванай, больш жорсткай, больш прафесійнай, чым мужчына. Ёй важна пры гэтым быць дагледжанай, гнуткай, ісці наперадзе. Жанчына цягне на сабе заўсёды большы груз.

— А на слабасці яна мае права?

— Не толькі мае, але ў гэтым яе перавага, выратаванне і крыніца натхнення. Жанчына паплакала, пакапрызіла і тым самым зняла напружанне, зноў можа ісці далей.

— 114 гадоў таму Клара Цэткін прапанавала ўстанавіць Міжнародны жаночы дзень, у які жанчыны маглі б ладзіць мітынгі і шэсці, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да сваіх праблем. У савецкія часы гэтае свята цалкам страціла палітычную афарбоўку. Які сэнс яно мае, на ваш погляд, цяпер?

— Для мяне 8 Сакавіка — гэта глыток жыцця. Вясновае свята, напоўненае станоўчымі эмоцыямі. У гэты дзень на баку жанчын сама прырода: усё ажывае, усё заліта сонцам. Гэта свята без эпохі, без узросту. Яно мае асаблівую аўру, якая нікога не пакідае абыякавым. Ніводны мужчына ў гэты дзень не забудзе купіць сваёй жанчыне кветкі. Не важна, хто яна — маці, нявеста, жонка, дачка або былая аднакласніца. І ці не цудоўна гэта?

— Што рабіў ваш тата ў гэты дзень, калі вы, усе тры дачкі, яшчэ жылі разам з бацькамі?

— Ён кожную з нас, а таксама нашу маці, віншаваў асобна. У кожнай была свая кветка ад таты.

— А муж гатуе сняданак на 8 Сакавіка?

— Гатуе — гучна сказана. Варыць каву. І падае ў ложак.

— Жанчыне складана быць шчаслівай?

— Складана. Шчасце — гэта не аморфная субстанцыя. Не павеў ветрыку. Складнікі шчасця — вынік вялікай працы. Працы на тое, каб у сям'і ўсё было добра, утульна, каб паміж усімі былі добрыя адносіны. Я, напрыклад, гляджу з мужам хакей, каб падзяліць з ім яго інтарэсы… Кузьма Пруткоў сказаў: «Хочаш быць шчаслівым — будзь ім». Але для гэтага патрэбны намаганні.

У мяне часам пытаюцца: які перыяд у жыцці самы шчаслівы? Думаю, шчасце — гэта тут і цяпер. У якім бы ты ўзросце ні быў. Мне вельмі спадабалася прытча пра мужчыну, які меў усё, акрамя пастаяннай жанчыны. Ён шэсць вечароў за кубкам чаю расказваў мудрацу пра дам, якіх сустрэў на сваім жыццёвым шляху. Але мудрэц усё не называў яму прычыну яго няўдачы. На сёмы дзень мудрэц прапанаваў проста папіць чаю, каб адчуць яго водар і смак. І тады мужчына зразумеў, чаму дагэтуль не сустрэў сваю адзіную. Вось і мы — бяжым па жыцці, не звяртаючы ўвагі адно на аднаго. У гэтым наша бяда. Каб адчуць водар і смак жыцця, неабходна на некаторы час спыніцца. Убачыць тых, хто побач.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДАЙЦЕ ДВА!

Колькасць рэалізаваных квіткоў на чэмпіянат свету па хакеі ў Мінску перавысіла 60 працэнтаў.

Пра гэта журналістам паведамілі падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай падрыхтоўцы да чэмпіянату. Па словах **менеджара па білетнай праграме Антона КУЗЬМІЧА,** колькасць прададзеных білетаў на матчы, што пройдуць на «Мінск-Арэне», складае ўжо каля 70 працэнтаў, на «Чыжоўка-Арэне» — 55 працэнтаў. Зараз назіраецца рост попыту на білеты. Пік продажу арганізатары чакаюць у красавіку. Квіткі на матчы можна набыць на сайце Ticketpro.by і ў касах кампаній-партнёраў («Евросеть», «Связной») па ўсёй рэспубліцы. Кошт наведвання аднаго матчу папярэдняга раўнда вагаецца ад 6 да 50 еўра, цэны білетаў на гульні фінальнай стадыі пачынаюцца з 60 еўра. Дэфіцыту квіткоў на матчы зборнай Беларусі, па інфармацыі арганізатараў, няма.

Антон Кузьміч звярнуў увагу на тое, што білеты, якіх ужо няма ў продажы (на матч адкрыцця і фінал турніру), яшчэ могуць з'явіцца ў прадаўцоў пасля вяртання тымі кампаніямі, што не змаглі іх рэалізаваць. Пропуск на гульні будзе ажыццяўляцца як па арыгінальных квітках, так і па электронных дакументах фармату E-Ticket.

Сярод замежных краін па колькасці набытых білетаў лідзіруюць нашы краіны-суседкі: Расія, Літва, Польшча, Украіна, а таксама Казахстан. Увогуле, наведаць чэмпіянат у Беларусь прыедуць госці з больш чым 40 краін, у ліку якіх і даволі экзатычныя: Тайвань, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Турцыя, Бразілія, Калумбія. У якасці візы замежныя госці могуць выкарыстоўваць квіткі чэмпіянату свету па хакеі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

ПАЛЯВАЦЬ НА ГУСЕЙ МОЖНА НЕ ПАЎСЮДНА

З другой суботы сакавіка па другую нядзелю мая ў краіне дазволена паляванне на гусей (белалобых, гуменнікаў, шэрых) і канадскіх казарак.

— Здабываць птушак можна зброевым спосабам з засады з падвабліваннем. Дазволена выкарыстоўваць гладкаствольную паляўнічую зброю з выкарыстаннем патронаў са шротам. Для пошуку і падачы здабытай дзічыны дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак: тэр'ераў, таксаў, выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак. Паляванне на вышэйназваныя віды дзічыны дазволена толькі ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 11 да 18 гадзін, — паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей.

Аднак варта нагадаць, што, згодна з пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, устаноўлена забарона на паляванне на вадаплаўную дзічыну ў веснавы сезон да 1 студзеня 2015 года ў некаторых паляўнічых угоддзях.

НЯМА СНЕГУ — НЯМА ПАВОДКІ

На сёння гідралагічная абстаноўка ў краіне застаецца стабільнай.

Згодна з аператыўнай інфармацыяй Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, цалкам ачысціліся ад лёду Нёман каля Гродна, Сож каля Гомеля, Прыпяць — на ўчастку Пінск — Чэрнічы і большасць яе прытокаў. На водных аб'ектах краіны працягваецца разбурэнне лядовага покрыва і адзначаюцца ваганні ўзроўню вады. Пры захаванні гэтых умоў надвор'я і адсутнасці ападкаў працэс веснавой паводкі абяцае быць малаактыўным і прайсці з мінімальнай шкодай. Спрыяльна на яе ўплывае адсутнасць снегавога покрыва і моцных ападкаў, што змяншае прыток вады ў рэкі.

ІНФАРМАЦЫЮ — У ШТАБЫ, ГАСЦІННАСЦЬ — У ЗОНЫ

Каардынаваць работу аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання падчас чэмпіянату свету па хакеі будзе рэспубліканскі штаб.

Ён размесціцца ў Міністэрстве гандлю. Плануецца, што ў штаб будзе збірацца для далейшага аналізу ўся інфармацыя ад арганізацый гандлю і грамадскага харчавання сталіцы, якія будуць абслугоўваць правядзенне міжнароднага спартыўнага мерапрыемства. Дадаткова плануецца стварыць аналагічныя штабы ў Мінгарвыканкаме і раённых адміністрацыях сталіцы, а таксама на абласным узроўні. Чакаецца, што рэспубліканскі штаб будзе працаваць практычна кругласутачна. Яго работа запланавана з 7 па 26 мая.

Падчас чарговага пасяджэння падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння і арганізацыі харчавання разглядаліся і пытанні адносна работы зон гасціннасці, фан-зон і VIP-зон. Падчас чэмпіянату будуць дзейнічаць тры зоны гасціннасці — каля Палаца спорту, у студэнцкай вёсцы і Лядовым палацы, размешчаным на вул. Прытыцкага. Зона гасціннасці каля Палаца спорту будзе займаць плошчу 13 тысяч квадратных метраў. Абслугоўваць яе будуць каля 700 чалавек. Сувенірную прадукцыю прапануюць сталічныя і прыезджыя рамеснікі. У аб'ектах грамадскага харчавання студэнцкай вёскі будзе створана амаль 2 тысячы пасадачных месцаў. Зоны гасціннасці пачнуць сваю работу ўжо з 1 мая.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Утерянные свидетельство о государственной регистрации ЧУП «БелТаможтранс» УНП 190615374, печать ЧУП «БелТаможтранс» и 2 штампа **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ГРОДНЕНСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»

	Лот № 1				
Наименование предмета торгов, краткая характеристика	**Капитальное строение с инв. № 621/С-13699** – сливной пункт одноэтажный, кирпичный площадью 110,8 кв.м, 1977 г.п.; **капитальное строение с инв. № 621/С-13750** – хранилище зерна башенного типа, 1979 г.п., площадью 127,2 кв.м в составе: 2 хранилища объемом по 1400 куб.м; 3 металлических ворот общей длиной 12,19 м; калитка металлическая; 2 ограждения общей длиной 293,87 м; **капитальное строение с инв. № 621/С-21021** – цементно-бетонное покрытие площадью 1340 кв.м				
Местонахождение имущества	Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 62 и 62/1				
Информация о земельном участке	Имущество расположено на земельном участке площадью 0,2921 га с кадастровым номером 624255700001001171, назначение – обслуживание зданий и сооружений				
Начальная цена предмета торгов	**1 049 833 314 рублей с учетом НДС**	Сумма задатка	**31 495 000 рублей**	Условия торгов	Без условий
Сведения о продавце	ОАО «Гродненский ликеро-водочный завод», г. Гродно, ул. Виленская, 22, тел. 8(0152) 77 17 89				
Сведения об организаторе торгов	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11				
Номер счета организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906				
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов		Условия оплаты	Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи	
Торги состоятся 10 апреля 2014 в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8					
Срок подачи документов для участия в торгах	**по 4 апреля 2014 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**				
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by					

Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11.

Извещение о проведении 18 марта 2014 г. повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	**Незавершенное незаконсервированное капитальное строение производственного корпуса «Комплект 1-ЭГ» общей площадью 22 412,3 кв.м**
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Казинца, 121а/48
Сведения о продавце	ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца, 121А, к. 327
Сведения об организаторе торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)	24 332 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	2 400 000 000 белорусских рублей
Условие торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 календарных дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **18 марта 2014 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.03.2014 по 14.03.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ООО «Табак-инвест» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 11 апреля 2014 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 24, каб. 221 ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПЛОЩАДЕЙ ДЛЯ ОСУЩЕСТВЛЕНИЯ РОЗНИЧНОЙ ТОРГОВЛИ кожгалантереей, аксессуарами, товарами для дома, предметами интерьера, сувенирами, подарками, пиротехникой, обувью, бижутерией, косметикой.

Предмет аукциона, ЛОТ № 49	**Продажа права заключения договора аренды части капитального строения (объекта № 49), находящегося в торговом центре «Корона», площадью 14,7 кв.м со ставкой арендной платы 80 долларов США за 1 кв.м с НДС в месяц**
Срок аренды	2 (два) года с даты заключения договора аренды
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Кальварийская, 24, торговый центр «Корона», 2 этаж
Начальная цена продажи предмета аукциона с НДС	10 000 000 (десять миллионов) белорусских рублей
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	10 000 000 (десять миллионов) белорусских рублей. Получатель платежа: ООО «Табак-инвест», УНП 101333138 Р/с 3012000003583 в ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО: 153001795 **Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.** Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Копия платежного поручения с отметкой банка прилагается к заявлению. В случае победы в аукционе задаток будет зачтен как плата за право заключения договора аренды. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате по договору аренды.
Характеристика недвижимого имущества	**ЛОТ №49:** расположен на 2 этаже торгового центра «Корона» между развлекательным центром «Дискавери» и магазином «SILVIAN HEACH». Общая площадь объекта – 14,7 кв.м.
Условия использования недвижимого имущества. Цель передачи в аренду	Розничная торговля кожгалантереей, аксессуарами, товарами для дома, предметами интерьера, сувенирами, подарками, пиротехникой, обувью, бижутерией, косметикой
Условия по передаче имущества в аренду	Соблюдение требований, изложенных в настоящем извещении, и победа в аукционе – предложение наибольшей цены за право заключения договора аренды. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить на расчетный счет организатора аукциона сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка. В случае, если победитель аукциона не подписал протокол о результатах аукциона, в установленные сроки не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона, не подписал договор аренды или акт приема-передачи помещения в аренду – условия аукциона считаются не соблюденными, результат аннулируется, задаток не возвращается.
Срок заключения договора аренды – не позднее 10 дней с даты проведения аукциона. Арендная плата взимается с даты открытия торгового объекта, но не позднее чем с 01.06.2014.	
Условия допуска к участию в аукционе	Для участия в аукционе лицо, желающее участвовать в аукционе, по **07.04.2014** включительно подает заявление (см. «образец заявления» на сайте www.korona.by) на участие в аукционе с указанием номера лота, по которому предполагается получение права заключения договора аренды по результатам аукциона. К заявлению прилагаются следующие документы: 1. копия платежного поручения с отметкой банка о перечислении задатка; 2. копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя или юридического лица; 3.копия устава юридического лица; 4. нотариально удостоверенная доверенность – представителем индивидуального предпринимателя; 5. доверенность на представление интересов, выданная юридическим лицом, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица – уполномоченным представителем либо руководителем юридического лица; 6. легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица – представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица; 7. документ с указанием банковских реквизитов индивидуального предпринимателя или юридического лица; 8. уведомление в произвольной форме об опыте работы в данном виде деятельности (период деятельности, количество и адреса местонахождения торговых объектов); 9. ассортимент товара, предполагаемый к реализации, с указанием диапазона розничных цен по каждой позиции; 10. краткое описание в произвольной форме, концепции использования площадей, по которым предполагается получения права заключения договора аренды; 11. эскизный план оборудования площадей; 12. фото действующих объектов. Копии документов, представляемых в комиссию, должны быть заверены в установленном законодательством порядке. Представитель юридического лица либо индивидуального предпринимателя, уполномоченный к подаче заявления на участие в аукционе, обязан предъявить документ, удостоверяющий личность.

Победитель торгов по одному из лотов не допускается к торгам по другому лоту.

Заявление на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 24, каб. 415 по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 13.30 до 16.00.

Последний день приема заявлений – 07 апреля 2014 года включительно.

К участию в аукционе допускаются лица, выполнившие в совокупности следующие условия:

в комиссию в сроки, указанные в извещении о проведении аукциона, подано заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов;

выражено согласие лица, желающего принять участие в аукционе, о заключении договора аренды на условиях, изложенных в проекте договора.

К участию в аукционе не допускаются лица:

не внесшие задаток;

представившие неполный пакет документов;

не имеющие опыта розничной торговли соответствующими цели передачи площади в аренду товарами либо опыт которых составляет менее одного года;

являющиеся арендаторами площадей ООО «Табак-инвест», при условии, что предметом аукциона являются площади, расположенные в тех же объектах и по аналогичному виду деятельности.

После получения необходимых документов от юридического лица либо индивидуального предпринимателя на участие в аукционе комиссия вручает его представителю уведомление с указанием даты регистрации заявления.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Возврат внесенного задатка осуществляется в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

В день проведения аукциона, не ранее чем за 30 (тридцать) минут до указанного в извещении времени аукциона, лица, желающие участвовать в аукционе, подавшие в установленном порядке заявления на участие в аукционе, обязаны зарегистрироваться в комиссии и получить аукционные номера. Аукционные номера получаются по предъявлению оригинала уведомления о принятии документов, которые возвращаются в комиссию после окончания аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Информация об аукционе размещена на сайте www.korona.by.
(раздел «лента событий»).

Контактные тел.: (8-017) 200-74-48, 200-00-69.